УДК 94(476):502.1"18/19

# ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАГА ЎРАДА ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАЛІТЫЧНА ДОБРАНАДЗЕЙНАГА І КВАЛІФІКАВАНАГА ЛЯСНОГА ЧЫНОЎНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

# RUSSIAN GOVERNMENT POLICY TO ENSURE A POLITICALLY PROSPEROUS AND QUALIFIED FOREST OFFICIALS IN THE TERRITORY OF BELARUS (XIXth – EARLY XXth CENT.)

***І. В. Пугач,***
*кандыдат гістарычных навук,*
*выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

***I. Pugach***
*candidate of historical sciences*
*lecturer of the department*
*of history of Belarus and Slavic peoples,*
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,*
*Minsk, Republic of Belarus*

Зберажэнне прыродных рэсурсаў традыцыйна прадстаўляла сабой прадмет асаблівай заклапочанасці дзяржавы, так як ажыццяўленне адпаведнай дзейнасці з’яўляецца неабходнай умовай для забеспячэння яе экалагічнай і гаспадарчай бяспекі. Каля 40 % тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пакрыта лесам. Нядзіўна, што ахове лясоў урад надае пільную ўвагу. Варта адзначыць, што развіццё эканомікі дзяржавы і знешняй эканамічнай кан’юнктуры абумоўлівае патрэбу адпаведных пераўтварэнняў сістэмы аховы лясоў. Таму падаецца неабходным асэнсаванне ўласных традыцый лесааховы, якія склаліся гістарычна. Змест дадзенага артыкула прысвечаны важнаму складальніку дзейнасці ўрада Расійскай імперыі па забеспячэнні функцыянавання дзяржаўнай лесаахоўнай сістэмы – захадам па забеспячэнні палітычна добранадзейнага і кваліфікаванага ляснога чыноўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. На падставе атрыманых вынікаў робіцца высновааб паспяховасці мерапрыемстваў урада ў адзначаным кірунку на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Conservation of natural resources has traditionally been a matter of special concern of the state, since the implementation of relevant activities is a prerequisite for ensuring its environmental and economic security. About 40% of the territory of the Republic of Belarus is covered with forest. Therefore, it is not surprising that the government pays close attention to forest protection. It should be noted that the development of the state economy and the external economic situation necessitates appropriate reforms of the system of forest protection. Therefore, it seems necessary to comprehend their own traditions of organizing forest protection activities that have formed historically. This article is devoted to an important component of government activities to ensure the state forest protection system – measures to ensure politically safe and qualified forest officials in the territory of Belarus in the XIXth – early XXth centuries. Based on the obtained results, a conclusion is made about the success of the government's measures in the indicated direction on the territory of Belarusian provinces.

• • • • • • • • • • • • • • • •

*Ключавыя словы:* беларускія губерні, ахова лясоў, лясныя чыноўнікі, лясная адукацыя.

*Keywords:* Belarusian provinces, forest protection, forest officials, forest education.

Ахове лясоў у Расійскай імперыі надавалася асаблівае значэнне. Гэта было абумоўлена роллю ляснай гаспадаркі ў эканамічнай сістэме дзяржавы. У разглядаемы перыяд урад быў зацікаўлены ў захаванні цэласнага стану дзяржаўных маёмасцей, у тым ліку і лясоў. Адзначанае з’явілася стымулам да канцэнтравання яго намаганняў, у тым ліку на забеспячэнні дзейнасці спецыяльнай дзяржаўнай лесаахоўнай адміністрацыі. Важнае значэнне пры гэтым мела пытанне падбору і прызначэння лясных служачых, якія б здолелі эфектыўна выконваць пастаўленыя ўрадам задачы. З улікам асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага і культурна-гістарычнага развіцця Расійскай імперыі ў цэлым і беларускіх зямель у прыватнасці, напружанасці мясцовага сацыяльна-палітычнага становішча, нядзіўна, што кадравая палітыка на тэрыторыі беларускіх губерняў мела свае спецыфічныя асаблівасці.

Аднымі з вызначальных фактараў пры камплектаванні корпусу лясных чыноўнікаў былі наяўнасць і ўзровень спецыяльнай адукацыі, а таксама іх палітычная добранадзейнасць. У сувязі з гэтым трэба адзначыць, што з пачатку XIX ст. да рэфармавання лясной часткі ў 1826 г. арганізацыю лесаахоўнай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялі больш за 150 чыноўнікаў. Абапіраючыся на звесткі, якія ўтрымліваюць фармулярныя спісы, толькі каля 13 % з іх мелі спецыяльную лясную адукацыю [1, с. 71]. Даволі невялікая доля такіх чыноўнікаў магла быць абумоўлена наступным. Як паведамляў міністр фінансаў у сваім дакладзе ад 14 красавіка 1803 г.: «…хотя во всех определениях… о помещении форстмейстеров и обер-форстмейстеров вносится всегда, что они по испытании найдены знающими в лесоводстве, но испытание сие составляет… токмо форму, ибо если бы оно произведено было на самом деле… места оные должны бы были оставаться не занятыми по всем почти губерниям потому что в России нет ещё, кроме некоторых иностранцев, знающих в лесной части людей» [2, с. 4]. Пры гэтым паступова ўрад распачаў вырашэнне пытання забеспячэння лясных чыноўнікаў спецыяльнай адукацыяй. Гэта выразілася ў стварэнні адпаведных навучальных устаноў. 19 мая 1803 г. адчыніла свае дзверы практычнае лясное вучылішча ў Царскім Сяле [3]. У 1811 г. лясное вучылішча было перанесена ў Санкт-Пецярбург і перайменавана ў Форшт-інстытут. 27 мая 1804 г., па праекце Калужскага обер-фарштмайстара Віфлінга, быў адкрыты лясны інстытут у Казельску [4]. У 1813 г. навучальная ўстанова была далучана да Форшт-інстытута. Такі ж лёс напаткаў у 1811 г. Лясны інстытут, які быў адчынены ў Пецярбурзе трыма гадамі раней [5, с. 56].

Важным падаецца звярнуць увагу на тое, што, не давяраючы мясцовым жыхарам, улады нярэдка запрашалі чыноўнікаў з рускіх і маларасійскіх губерняў. Але прыезжыя службоўцы нядоўга заставаліся ў краі, дзе для іх усё было чужое – мова, звычаі, вера і дзе да іх з недаверам ставілася мясцовае насельніцтва. У сувязі з недахопам рускіх чыноўнікаў, яшчэ Кацярына II дазволіла прызначаць на адміністрацыйныя пасады ў новаўтвораных губернях мясцовых жыхароў. Чыноўнікаў неабходна было «выбіраць з тых, хто непахіснай вернасці, пры валоданні ўласнасцю і пры іншых якасцях мелі чыны польскія» [6, с. 53]. Трэба адзначыць, што ўрад часткова абапіраўся на тыя традыцыі, якія склаліся на папярэднім этапе развіцця мясцовай дзяржаўнай лясной адміністрацыі. Так, яшчэ ў пачатку 20-х гг. XIX ст. у Мінскай губерні службу нёс лоўчы Пётр Мустафа. Варта звярнуць увагу на тое, што пасада лоўчага не прадугледжвалася расійскім узорам уладкавання ляснога чыноўніцтва. Прычына таго, што ён быў пакінуты на службе тлумачылася так: «…находился более 20 лет при… графе Салогубе в звании ловчего, или смотрителя за лесами и лесничими. Как сведущего человека для сохранения границ и леса его приняли решение оставить при оных лесах…» [7, арк. 289 адв. – 290]. Разам з тым, вялікая колькасць лясных чыноўнікаў несла ваенную службу ці удзельнічала ў ваенных дзеяннях, у т. л. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, супраць французскіх войскаў падчас вайны 1812 г. і г. д., чым паказвала сваю лаяльнасць да расійскага ўрада [1, с. 71]. Такім чынам, адзначанае дае падставу меркаваць, што ў гэты час палітычная добранадзейнасць кандыдатаў была больш важным крытэрыем пры камплектаванні штату лясных чыноўнікаў чым узровень іх адукацыі.

Абапіраючыся на змест фармулярных спісаў лясных чыноўнікаў беларускіх губерняў, можна ўстанавіць, што ў 1835–1836 гг. службу на тэрыторыі Беларусі несла каля 70 лясных чыноўнікаў. У канфесійным разрэзе сярод мясцовых чыноўнікаў пераважалі асобы каталіцкага веравызнання (57,6 %), другое месца належала праваслаўным (24,2 %). Найменш прадстаўлены былі прыхільнікі евангелічнага хрысціянства і ісламу (6,1 % і 1,5 % адпаведна). Трэба адзначыць, што канфесійную прыналежнасць 10,6 % лясных чыноўнікаў вызначыць не ўдалося [1, с. 71; 8, арк. 2 адв.–235; 9, арк. 2 адв.–258; 10, арк. 5 адв.–65, 157 адв.–206; 11, арк. 3 адв.–346; 12, арк. 42 адв.–104, 197 адв.–370; 13, арк. 3 адв.–100; 14, арк. 3 адв.–22, 281 адв.–290; 15, арк. 170 адв.–200; 16, арк. 6 адв.–152, 297 адв.–322]. Адзначанае, у сваю чаргу можа сведчыць аб тым, што ў гэты час лясныя служачыя не падвяргаліся істотнай канфесійнай дыскрымінацыі.

У пэўным сэнсе характар кадравай палітыкі змяніўся ў сярэдзіне – другой палове XIX ст. Яе спецыфіка, з аднаго боку, выявілася ў мэтанакіраваным памяншэнні колькасці лясных чыноўнікаў каталіцкага веравызнання, што было выклікана імкненнем урада да пазбягання дэстабілізацыі грамадска-палітычнага становішча ў краі. Так, згодна са зместам справы «О замещении должностей в Западных губерниях лицами русской национальности», у 1855 г. на імя міністра унутраных спраў Бібікава паступіла сакрэтнае паведамленне, паводле якога імператар загадаў: «…Всем Министрам и Главноуправляющим… подтвердить… к непременному исполнению… повеление, о замещении в Западных губерниях должностей, в том повелении поименованных… чиновниками Русского происхождения... принять… меры к постепенному… замещению и прочих должностей… из Русских и переводу туземцев в Великороссийские губернии… Постановить… чтобы никто из уроженцев Западных губерний, кроме… исповедающих Право-

славную веру, не мог быть там определяем на службу ежели не прослужил прежде десяти лет в Великороссийских губерниях, или в войсках в офицерских чинах, да… тех только переводить, которые оказались совершенно благонадёжными…» [17, арк. 1–2]. Разумеючы, што дадзены захад меў шэраг істотных недахопаў і мог прывесці да дэстабілізацыі абстаноўкі, у сваім данясенні міністру ўнутраных спраў Віленскі, Гродзенскі і Ковенскі генерал-губернатар У. І. Назімаў адзначаў, што такія радыкальныя і імклівыя кадравыя рашэнні немагчымы, у сувязі з добрасумленным выкананнем мясцовымі службоўцамі сваіх абавязкаў, а таксама складанасцю прыцягнення чыноўнікаў належнай кваліфікацыі з унутраных расійскіх губерняў [17, арк. 7–13 адв.]. Камітэт міністраў, разгледзеўшы дакладную запіску генерал-губернатара, адказаў: «…При каждой открывающейся… вакансии, должно стараться о замещении этой вакансии чиновником из Русских, и исполнить это действительно, когда окажется к этому возможность. Таким образом цель… будет достигнута исподволь и без… стеснения туземцев…» [17, арк. 31 адв.–33 адв.].

Вынікі палітыкі ўрада ў гэтым кірунку могуць быць яскрава праілюстраваны наступнымі данымі. Як адзначалася, у 1835–1836 гг. больш за палову адпаведных служачых на тэрыторыі беларускіх губерняў адносіліся да каталікоў. Пры гэтым, сярод лясных чыноў найбольшая колькасць каталікоў была зафіксавана ў Віцебскай (88,9%), Віленскай (84,6%) і Гродзенскай (71,4%) губернях [8, арк. 222 адв.–235; 10, арк. 177 адв.–183, 184 адв.–193, 200 адв.–206; 12, арк. 342 адв.–370; 15, арк. 188 адв.–200; 16, арк. 297 адв.–299, 305 адв.–322]. 22 мая 1864 г., у выніку падзей паўстання 1863–1864 гг., быў прыняты ўказ, адпаведна якому каталікам забаранялася займаць кіруючыя пасады ў органах дзяржаўнага кіравання. Гэта тычылася і лясных чыноў [18, арк. 71]. У выніку адзначанага, у 1869 г. у складзе лясной адміністрацыі пяці беларускіх губерняў каталікоў было каля 5 %, а доля праваслаўных лясных чыноўнікаў складала каля 72 % [19, с. 54–55; 20, с. 53–55; 21, с. 36, 38–40; 22, с. 97, 99–100; 23, с. 63, 65–66]. Пры гэтым, пры найме на працу ў першую чаргу ўлічвалася палітычная добранадзейнасць служачых. Так, напрыклад, згодна са звесткамі за 1866 г., каля 68% лясных чыноўнікаў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў мелі медалі «За усмирение польского мятежа» [24, с. 60, 64–65; 25, с. 32, 34–35; 26, с. 24–25, 27]. У 1869 г. у пяці беларускіх губернях такім медалём былі ўзнагароджаны каля 30 % лясных чыноўнікаў [19, с. 54–55; 20, с. 53–55; 21, с. 36, 38–40; 22, с. 97, 99–100; 23, с. 63, 65–66].

З другога боку, адметнай асаблівасцю разглядаемага перыяду трэба лічыць значны рост колькасці чыноўнікаў, якія валодалі спецыяльнай лясной адукацыяй. Гэта было следствам двух узаемазвязаных фактараў – павышэння ролі лясной гаспадаркі ў сацыяльна-эканамічным жыцці дзяржавы і развіцця лесазнаўства, а таксама сеткі лясных навучальных устаноў. Для вырашэння пытання забеспячэння лясных чыноў неабходнай кваліфікацыяй у 1837 г. Лясны інстытут быў рэарганізаваны ў ваенна-навучальную ўстанову і атрымаў назву Лясны і Межавы інстытут. Акрамя таго, у 1859 г. пры ім быў адкрыты спецыяльны курс для лясных чыноўнікаў, якія мелі вышэйшую няпрофільную адукацыю, які цягнуўся 17 месяцаў. У 1864 г. Лясны інстытут быў зачынены, а яго замяніла адкрытая 1 кастрычніка 1863 г. у Санкт-Пецярбурзе Лясная акадэмія. Аднак ужо ў 1865 г. акадэмія была зачынена, так як у гэтым годзе паблізу ад Масквы была заснавана Пятроўская земляробчая і лясная акадэмія. Варта адзначыць, што выкладанне лесаводства працягвалася ў Санкт-Пецярбургскім земляробчым інстытуце, які размясціўся ў будынках былога Ляснога інстытута. Туды ўстанова была пераведзена ў 1863 г. з Магілёўскай губерні, дзе яна інсавала пад назвай Горы-Горыцкага земляробчага інстытута. 15 красавіка 1880 г. было прынята рашэнне аб узнаўленні дзейнасці Пецярбурскага ляснога інстытута. У 1886 г. лясное аддзяленне Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі было зачынена. Акрамя таго, лясную адукацыю даваў Новаалександрыйскі інстытут сельскай гаспадаркі і лесаводства. Ён быў заснаваны ў 1816 г., як агранамічны інстытут, а з 1840 г. атрымаў назву Інстытута сельскай гаспадаркі і лесаводства. У 1860-я гг. быў пераведзены ў Новаалександрыю. У пачатку 1890-х гг. для ўстановы было зацверджана новае палажэнне і яна была прыраўнована да ўніверсітэтаў Расіі [27, с. 270–275; 28; 29].

Важнае значэнне мелі правільна арганізаваныя практычныя вучэбныя лясныя заняткі. Яшчэ выхаванцы былога форшт-інстытута штогадова летам накіроўваліся на іх у бліжэйшыя дачы Санкт-Пецярбургскай губерні. У 1834 г. для гэтай мэты было ўтворана Лісінскае вучэбнае лясніцтва. Акрамя таго, у 1834 г. была адчынена Лісінская егерская школа (з 1869 г. – Лісінскае лясное вучылішча). У хуткім часе патрэба ў навучальных установах падобнага тыпу прывяла да адкрыцця егерскіх вучылішч у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі: Астроўскае ў Маскоўскай губерні – у 1844 г., лесатэхнічная школа пры Валагодскай узорнай ферме – у 1850 г., Ліпецкае егерскае вучылішча пры Раманава-Тавалжанскай лясной дачы – у 1858 г. Важнай падзеяй у развіцці лясной адукацыі на беларускіх землях стала адкрыццё 27 кастрычніка 1847 г. у Гродзенскай губерні пісарскага і егерскага вучылішча. Гэтыя

вучылішчы праіснавалі да 60-х гг. XIX ст. [27, с. 270–275; 28; 30, с. 232–233; 31]. Асноўнай задачай гэтых навучальных устаноў была падрыхтоўка ў дапамогу ляснічым толькі ніжніх лясных чыноў, якія добра валодалі практыкай лясных работ. Паступова лясныя школы і вучылішчы пачалі ўспрымацца як сродак падрыхтоўкі галоўным чынам такіх кандуктараў, на якіх у перспектыве можна было б ускласці абавязкі па загадванні лясніцтвамі. Пры гэтым з'явілася патрэба, адмовіўшыся ад утрымання вялікай колькасці навучальных устаноў такога тыпу, утварыць адну, якая б давала належную тэарэтычную падрыхтоўку. Следствам гэтага стала паступовае закрыццё ўсіх школ, выключаючы Лісінскую. Па палажэнні 1869 г., яна была перайменавана ў Лісінскае лясное вучылішча. Узровень выкладання тут быў істотна павышаны. Выхаванцы, якія паспяхова скончылі ўстанову, атрымалі права быць узведзенымі ў класны чын і з цягам часу заняць месцы ляснічых [27, с. 273]. Пры гэтым, колькасць асоб, якія скончылі вышэйшыя лясныя навучальныя ўстановы, значна ўзрастала. У сваю чаргу менавіта ім надавалася перавага пры прызначэнні на адпаведныя пасады. Гэтая акалічнасць выявіла непатрэбнасць існавання Лісінскага ляснога вучылішча ў такім выглядзе. У сувязі з гэтым, у 1886 г. быў спынены набор у Лісінскае вучылішча. 19 красавіка 1888 г. выйшла «Положение о низших лесных школах» [32]. Згодна з яго зместам, былі адкрыты 10 ніжэйшых лясных школ, а Лісінскае лясное вучылішча прыпыняла сваю дзейнасць з 1 ліпеня 1888 г. Установы адукацыі адзначанага тыпу ўтвараліся з мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для замяшчэння ніжэйшых пасад (кандуктараў) па лясным упраўленні. На тэрыторыі Беларусі былі адкрыты Вяляціцкая пры 2-м Барысаўскім лясніцтве (1896 г.), Кошалеўская пры Лепельскім лясніцтве (1902 г.), Полацкая (1902 г.) і Буда-Кашалёўская лясныя школы [33; 34, с. 122, 125, 129].

У выніку ўсяго адзначанага да канца XIX ст. сярод мясцовых загадчыкаў лясніцтваў, памочнікаў ляснічых і лясных кандуктараў большасць атрымалі неабходную адукацыю ў спецыяльных лясных навучальных установах. У 1879 г. у Віленскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях звыш 52 % загадчыкаў лясніцтвамі мелі спецыяльную адукацыю [35, арк. 42–45; 36, арк. 60–63; 37, арк. 16–33; 38, арк. 36–43]. Згодна з данымі справаздачы за 1883–1884 гг., адпаведны паказчык складаў 73,02 %. У Расійскай імперыі ў цэлым у гэты ж час доля чыноўнікаў з ляснoй адукацыяй складала 79,79 % [39, с. 1–8].

У канцы XIX ст. дасягнутыя поспехі ў справе фармавання добранадзейнага складу лясных чыноў у краі і паніжэнні долі асоб каталіцкага веравызнання сярод іх былі замацаваны. Напрыклад, у перыяд з 1891 па 1900 г. у Віленскай губерні (дзе па выніках перапісу 1897 г. 58,8 % насельніцтва адносілася да каталікоў, 27,7 % – да праваслаўных, 12,9 % – да іншых канфесій) службу неслі 82 лясныя чыноўнікі (лясныя рэвізоры, ляснічыя і іх памочнікі (у т. л. кандуктары). З іх 74 чал., ці 90,24%, адносіліся да праваслаўных, 4, ці 4,88%, – да лютэран, 2, ці 2,44%, – да каталікоў (веравызнанне 2 служачых устанавіць не ўдалося), прычым істотная колькасць служачых мелі ўрадавыя ўзнагароды рознага кшталту [40, с. 156, 205–206, 218, 231, 245, 258, 271–272, 288; 41, с. 165–166, 220, 234–235, 248–249, 279, 293, 311; 42, с. 175–176, 238, 253–254, 270, 287, 304, 320–321, 340; 43, с. 180–181, 248, 265–266, 283, 301, 319, 337, 357; 44, с. 184–185, 260, 278, 295–296, 314, 333, 350, 369; 45, с. 97, 227, 242, 258, 273, 290, 304, 320; 46, с. 55, 108–109, 118, 129, 140–141, 151, 161, 172; 47, с. 72–73, 177, 187, 199, 211, 223, 233, 247; 48, с. 50, 237–238, 252, 267, 282–283, 298, 315; 49, с. 54–56]. Нягледзячы на падобную карціну, урадам па-ранейшаму праводзілася палітыка, скіраваная на недапушчэнне вялікай колькасці каталікоў да пасад у дзяржаўных установах. Так, напрыклад, летам 1899 г. Гродзенскім губернатарам была пацверджана непажаданасць прыёму на службу каталікоў, што тлумачылася іх актыўнай уключанасцю ў антыдзяржаўную дзейнасць [50, арк. 17–17 адв.]. Акрамя таго, па-ранейшаму забаранялася выкарыстанне польскай мовы ў прысутных установах. Гэта пацвярджаецца адпаведным палажэннем 23 сакавіка 1884 г. Прыкладам дзейнасці гэтага абмежавання можа з'яўляцца звальненне аднаго з аб'ездчыкаў у Гродзенскай губерні за размову на польскай мове ў валасным праўленні ў восень 1892 г. [50, арк. 9–10]. У сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі, урадам істотна абмяжоўвалася права дзяржаўных служачых на ўдзел у палітычных партыях і рухах, што пацвярджалася цыркулярам Савета міністраў ад 14 верасня 1906 г. [51, арк. 1–3 адв.]. У сувязі з адзначаным, старшыні ведамстваў павінны былі зрабіць належныя па падначаленай ім частцы распараджэнні. Нагляд за дакладным выкананнем такіх распараджэнняў ускладаўся на міністраў і галоўных начальнікаў, генерал-губернатараў, губернатараў і кіраўнікоў мясцовых устаноў [51, арк. 2–4 адв.].

Акрамя таго, захоўвалася тэндэнцыя да павелічэння колькасці лясных чыноўнікаў, якія валодалі спецыяльнай адукацыяй па лясной частцы. Так, у 1900 г. звыш 80 % лясных служачых Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў атрымалі спецыяльную адукацыю (астатнія скончылі ўстановы, дзе выкладаліся лясныя дысцыпліны) [49, с. 54–56; 52, с. 25, 77, 86, 95, 110, 129, 139, 156, 167, 178, 186, 187; 53, с. 46, 47, 76, 84, 96, 108, 118, 128, 137, 147, 156; 54, с. 65–66].

Такім чынам, на падставе адзначанага, можна зрабіць наступную выснову. Дзякуючы дзейнасці ўрада на працягу разглядаемага перыяду, паспяхова былі ажыццёўлены захады па камплектаванні асабовага складу лаяльнымі царызму кадрамі, мэтанакіраваным памяншэнні колькасці лясных чыноўнікаў каталіцкага веравызнання, што было выклікана імкненнем урада да пазбягання дэстабілізацыі грамадска-палітычнага становішча ў краі, а таксама па арганізацыі сістэмы навучальных устаноў, якія давалі профільную лясную адукацыю. Следствам гэтага стала фарміраванне палітычна добранадзейнага і кваліфікаванага ляснога чыноўніцтва на тэрыторыі беларускіх губерняў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Пугач, І. В. Лесаахоўныя мерапрыемствы расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (другая палова 70-х гг. XVIII – першая палова 30-х гг. XIX ст.) / І. В. Пугач // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2019. – № 2. – С. 69–74.
2. Исторический очерк развития Санкт-Петербургского лесного института (1803–1903) / Э. Э. Керн [и др.] ; под общ. ред. Э. Э. Керна. – СПб., 1903. – 193, 157 с.
3. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – 1-е собр. – Т. 27. – Отд. 1. – № 20766. – С. 620–622.
4. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 28. – Отд. 1. – № 21302. – С. 329–337.
5. Столетие учреждения Лесного департамента. 1798–1898 . – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1898. – [9], 251 с.
6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с.
7. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбурзе (далей – РДГА). – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 115.
8. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 85.
9. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 93.
10. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 94.
11. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 110.
12. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 111.
13. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 114.
14. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 115.
15. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 116.
16. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 117.
17. РДГА. – Ф. 1282. Воп. 2. Спр. 330.
18. РДГА. – Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106.
19 Памятная книжка Виленской губернии на 1869 г. – Вильна: типография губернского правления, 1869. – VII, 213 с.
20. Памятная книжка Витебской губернии на 1869 г. – Витебск: типография губернского правления, 1869. – VI, 180 с.
21. Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 г. – Гродно: типография губернского правления, 1869. – 139, XI, 180 с.
22. Памятная книжка Минской губернии на 1869 г. – Минск: типография губернского правления, 1868. – 341, 6 с.
23. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1869 г. – Могилёв: типография губернского правления, 1868. – V, 345 с.
24. Памятная книжка Виленской губернии на 1866 г. – Вильна: типография А. Сыркина, 1866. – VIII, 230 с.
25. Памятная книжка Витебской губернии на 1866 г. – Витебск: типография К. Вульфа, 1866. – VIII, 218, 144 с.
26. Памятная книжка Гродненской губернии на 1866 г. – Гродно: типография губернского правления, 1866. – 65, 50, 84 с.
27. Арнольдь, Ф. К. История лесоводства в России, Франции и Германии / Ф. К. Арнольд. – СПб. : Издание А. Ф. Маркса, 1895. – 403, [2] с.
28. Мерзленко, М. Д. История зарождения и становления лесного образования в России / М. Д. Мерзленко // Лесной вестн. – 2005. – № 5. – С. 158–161.
29. Новоалександрийский институт сельского хозяйства и лесоводства // Большая советская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bse.slovaronline.com/23379 NOVOALEKSANDRIISKIY_INSTITUT_SELSKOGOHOZYAYSTVA_I_LESOVODSTVA. – Дата доступа: 18.05.2020.
30. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба : в 39 т. / Гродненская губерния : в 2 ч. / сост. П. О. Бобровский. – СПб. : Типография Иосфата Огризко, 1863 г. – Ч. 2. Приложения – 504 с.
31. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 22. – Отд. 1. – № 21645. – С. 786.
32. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5158. – С. 177–179.

33. Евдокимов, И. В. К истории низших лесных школ в России / И. В. Евдокимов, Н. Н. Неволин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.booksite.ru/rusles/st_0003.html. – Дата доступа: 12.05.2020.
34. Новик, Н. Е. Профессиональное образование в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Н. Е. Новик. – Минск, 1999. – 129 с.
35. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1291.
36. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1314.
37. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1342.
38. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1345.
39. Ведомость № 4 «Организация местного лесного управления по губерниям» // Отчёт по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1883 и 1884 гг. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб. : Типография Морского министерства, 1886. – 8 с.
40. Памятная книжка Виленской губернии на 1891 г. – Вильна: губернская типография, 1890. – XII, 64, 375, 222 с.
41. Памятная книжка Виленской губернии на 1892 г. – Вильна: губернская типография, 1891. – XII, 404, 187 с.
42. Памятная книжка Виленской губернии на 1893 г. – Вильна: губернская типография, 1892. – XII, 436, 167 с.
43. Памятная книжка Виленской губернии на 1894 г. – Вильна: губернская типография, 1893. – XII, 452, 162 с.
44. Памятная книжка Виленской губернии на 1895 г. – Вильна: губернская типография, 1894. – XII, 468, 151 с.
45. Памятная книжка Виленской губернии на 1896 г. – Вильна: губернская типография, 1895. – X, 408, 106, [1] с.
46. Памятная книжка Виленской губернии на 1897 г. – Вильна: губернская типография, 1896. – VIII, 208, 42, 73 с.
47. Памятная книжка Виленской губернии на 1898 г. – Вильна: губернская типография, 1897. – XIX, 336, 298 с.
48. Памятная книжка Виленской губернии на 1899 г. – Вильна: губернская типография, 1898. – XIX, 321, 431 с.
49. Памятная книжка Виленской губернии на 1900 г. – Вильна: губернская типография, 1899. – XV, 336, 94 с.
50. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 143.
51. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 288.
52. Памятная книжка Витебской губернии на 1900 г. – Витебск: губернская типолитография, 1899. – VII, 36, 243, 157 с.
53. Памятная книжка Гродненской губернии на 1900 г. – Гродно: губернская типография, 1899. – 30, 40, 314, 41, 76, 86 с.
54. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1900 г. – Могилёв на Днепре: типография губернского правления, 1900. – IX с., 211 с., XXIX с., 112 с., [195].


***Дата подачи статьи: 28.01.2021***